КІНО, ЯКОЕ ВЫКЛІКАЕ СПРЭЧКІ

5

ДАБРО ВЯРТАЕЦЦА...

13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

+ТВ ПРАГРАМА

22 ЛІПЕНЯ 2022 г. ПЯТНІЦА № 142 (29764)

КАРАТКА

- «Белэнерга»: планавага адключэння электрасетак у ацяпляльны сезон не будзе.
- **«Аэрафлот» з 22 ліпеня ўвёў яшчэ адзін рэйс з Масквы ў Мінск.**
- Экспарт беларускіх тавараў у Кітай за пяць месяцаў узрос у 1,5 раза.
- **У Беларусі на паўгода ўвялі ліцэнзаванне экспарту льновалакна.**

ЦЫТАТА ДНЯ

Руслан ПАРХАМОВІЧ, міністр архітэктуры і будаўніцтва:

«Па выніках работы за I квартал 2022 года кошт квадратнага метра з дзяржпадтрымкай сфарміраваўся ў памеры Br1176. Гэты кошт суадносіцца з сярэдняй заработнай платай па краіне. Цяпер іх суадносіны 0,76. У будаўніцтве жылля ёсць і спадарожныя выдаткі: праектаванне, работы па жаданні заказчыка, тэхнагляд. Сёння асноўная ўвага аддадзена якраз гэтым спадарожным выдаткам. Мы іх вельмі старанна аналізуем. Думаю, што за кошт гэтага і будзем імкнуцца да яшчэ большага скарачэння кошту будаўніцтва жылля з дзяржпадтрымкай. Адзначу, што цана на жыллё будзе скарэкціравана прыкладна на 3-5 % у бок патанення. Гэта таксама будзе распаўсюджвацца на кошт камерцыйнага жылля. Заказчыкі дзейнічаюць па адных правілах і пры будаўніцтве жылля з дзяржпадтрымкай, і на камерцыйным жыллі».

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Я АБГРУНТОЎВАЮ ГЭТА ТЫМ, КАБ ЗАЎТРА БЫЛО ЛЮДЗЯМ ЛЕПШ»

Беларускі лідар аб дыктатуры, панславянскім свеце і сітуацыі на планеце

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка даў інтэрв'ю інфармацыйнаму агенцтву «Франс Прэс». З кіраўніком дзяржавы размаўляў намеснік дырэктара і галоўны рэдактар бюро інфармацыйнага агенцтва «Франс Прэс» у Маскве Антуан Ламбраскіні. Беларускі лідар адказаў на многія актуальныя пытанні журналіста. Падчас інтэрв'ю, якое працягвалася больш за гадзіну, бакі закранулі такія тэмы, як унутрыпалітычная сітуацыя ў Беларусі, адносіны Беларусі і Расіі. Зноў былі ўзняты сітуацыя вакол самалёта Ryanair і расследаванне ІКАО. Аляксандр Лукашэнка падзяліўся сваімі поглядамі на дыктатуру і санкцыі Захаду. Кіраўнік дзяржавы расказаў, калі скончыцца канфлікт ва Украіне і якая роля Беларусі ў расійскай спецаперацыі.

Фота БелТА.

«ВОСЬ ТАДЫ БУДЗЕ ДЫКТАТУРА»

Журналіст закрануў тэму дыктатуры ў Беларусі, сваім бачаннем на якую падзяліўся Аляксандр Лукашэнка. «Цяпер усе кажуць пра голад. І я згодны, што мы вельмі блізка ад гэтага бар'ера. Голад проста стукаецца. Многія галадаюць ужо. Можна было б сказаць: «Не крытычна». Але як «не крытычна», калі кожныя 10 секундаў паміраe дзіця ў свеце? Не голад? Голад. І я вельмі жорстка цяпер стаўлю пытанне (гэта датычыцца сялян, ды і ўсёй краіны) па ўборцы ўраджаю. Трэба сабраць усё. Трэба мабілізавацца. Бо, крый божа, голад — вось тады будзе дыктатура. І ў Францыі ў тым ліку. Трэба народ выратаваць. Не накарміць, а выратаваць, каб людзі не памерлі», — сказаў беларускі лідар. Ён адзначыў, што такія жорсткія патрабаванні кіраўніка дзяржавы могуць быць расцэнены як дыктатура, але ў падобным выпадку гэта апраўдана важнай мэтай — палепшыць жыццё людзей, не дапусціць крытычных сітуацый.

«Калі ласка, можаце мяне за гэта крытыкаваць. Але я гэта абгрунтоўваю тым, каб заўтра было людзям лепш. А не тое, што мне вось хочацца дыктаваць і я з глузду з'ехаў, седзячы ў цэнтры Еўропы, у адносна невялікай краіне, з невялікім насельніцтвам, я чагосьці пачынаю дыктаваць і яшчэ душыць уласны народ, які прагаласаваў за мяне даўным-даўно і падтрымлівае мяне да гэтага часу», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

СТАР. 2

Прыёмная кампанія — 2022

«Момант ісціны» для абітурыентаў

Найлепшыя веды на ЦТ дэманструюць выпускнікі гімназій і ліцэяў

Абсалютны вынік — 100 балаў — паказалі сёлета 337 удзельнікаў ЦТ па 12 вучэбных прадметах. 314 чалавек атрымалі адзін стабальны сертыфікат. Двойчы па сто балаў здолелі набраць 22 абітурыенты (у 2021 годзе такіх было 25, у 2020-м — 15 чалавек). А ў абітурыенткі Настассі Більдзь проста фенаменальны вынік — тры стабальныя сертыфікаты: па беларускай мове, матэматыцы і фізіцы. Сярэднюю школу № 8 Ліды дзяўчына скончыла з сярэднім балам атэстата «10». Такім чынам у яе на руках была максімальна магчымая сума балаў (400), якая дазваляла ёй паступіць у любую ВНУ краіны. Настасся ўжо вызначылася з выбарам і падала свае дакументы ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі на спецыяльнасць «Інфарматыка і тэхналогіі праграмавання».

У роўных умовах

Як расказала журналістам **начальнік упраўлення па распрацоўцы і сертыфікацыі тэстаў Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Таццяна УЛАСЕНКА** для ўдзелу ў ЦТ сёлета зарэгістраваліся 61786 абітурыентаў, з іх 1,5 тысячы на ўступныя іспыты не з'явіліся. Практычна кожны трэці абітурыент рэгістраваўся на чатыры вучэбныя дысцыпліны. Таксама для ўдзелу у беларускім ЦТ сёлета зарэгістраваліся 191 грамадзянін Расійскай Федэрацыі і 14 грамадзян Рэспублікі Казахстан.

За розныя парушэнні парадку правядзення ЦТ былі выдалены дзевяць чалавек. Не прайшлі тэсціраванне з-за медыцынскіх паказанняў — 18. Ім далі магчымасць узяць удзел у ЦТ у рэзервовыя дні.

Самы высокі вынік цэнтралізаванага тэсціравання ў рэзервовыя дні — 98 балаў (па беларускай мове). Ёсць таксама два вынікі па 97 балаў. Адзін абітурыент здаў паспяхова матэматыку, а другі — англійскую мову.

Самымі запатрабаванымі прадметамі на ЦТ у 2021 годзе былі руская мова (на яе зарэгістраваліся 50 389 абітурыентаў) і матэматыка (33 835 чалавек). А сярод замежных моў лідзіравала англійская (24 180 абітурыентаў).

СТАР. 3

Ігар ШУНЕВІЧ:

«ТАВАРЫСТВА ПАДОБНАЕ НА КАРАБЕЛЬ. КРУТА ПАВАРОЧВАЦЬ ЯГО НЕ ЗБІРАЮСЯ»

Ігара Шуневіча ўсе ведаюць як міністра ўнутраных спраў з 2012 да 2019 года. З восені мінулага года генерал-лейтэнант міліцыі запасу ўзначальвае Беларускае таварыства паляўнічых і рыбаловаў, і гэта таксама не засталося незаўважаным. Пра таварыства адразу ж загаварылі ў СМІ. Новую эпоху жыцця грамадскай арганізацыі пазначыла нядаўняе наваселле цэнтральнага апарату. Сам старшыня звярнуўся з шэрагам прапаноў да ўрада, далажыў аб стане спраў кіраўніку дзяржавы, у ліпені ўступаюць у сілу пэўныя заканадаўчыя змяненні ў дадзенай сферы. І, падобна, гэта толькі пачатак. «Звязда» распытала кіраўніка БТПР пра яго ідэі і бачанне развіцця паляўніцтва і рыбалоўства ў Беларусі.

СТАР. 4

«Я АБГРУНТОЎВАЮ ГЭТА ТЫМ, КАБ ЗАЎТРА БЫЛО ЛЮДЗЯМ ЛЕПШ»

«АЛЕ МЫ СЛАВЯНЕ»

Падчас размовы журналіст выказаў меркаванне, што Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін, наколькі можна меркаваць па яго выказваннях, марыць аб нейкай славянскай дзяржаве. Аднак Аляксандр Лукашэнка прызнаўся, што гэта ён марыў аб стварэнні панславянскай дзяржавы ці аб'яднанні краін. «Гэта я марыў пра славянскую дзяржаву. Яны прапіхвалі ідэю рускага свету. Гэта я заўсёды з 1990-х гадоў казаў пра тое, што ёсць славянскія дзяржавы. Я бачыў там палякаў, славакаў, балгараў і іншых. І мы не павінны страчваць вось гэтую сувязь. Так, кожны жыве ў сваёй дзяржаве. Але мы славяне. Я пра гэта гаварыў. Таму Пуцін ні пра якую панславянскую дзяржаву не гаварыў і не марыў. Гэта вы ўжо прыдумалі», — сказаў ён.

КАНФЛІКТ ВА УКРАІНЕ

Асобна Антуан Ламбраскіні спыніўся на сітуацыі ва Украіне. Прэзідэнт Беларусі заявіў, што вайну ў суседняй краіне можна скончыць хоць цяпер, але ёсць галоўная ўмова.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў першую чаргу Украіна павінна сесці за стол перагавораў і пагадзіцца, што яны ніколі не будуць пагражаць Расіі і не будуць мець на тэрыторыі Украіны тую зброю, якая будзе пагражаць расійскай тэрыторыі. Гэта ён назваў галоўным. «А дэнацыфікацыя і іншае — гэта філасофія. Галоўнае — бяспека Расіі. Ніколі расійская ўлада, маючы гэтую моц і багацці Расіі, не адступіцца ад гэтага. Дайце гарантыі. Дапамажыце Кіеву. Кіеў дасць гэтыя гарантыі, калі вы, натаўцы і амерыканцы, пагодзіцеся, што з тэрыторыі Украіны ніколі не будзе пагрозы расійскай тэрыторыі. А тады Расія дасць гарантыі бяспекі Украіне», — пераканаў беларускі лідар.

«Якая Украіна? Там яшчэ будуць Херсон, Данецк, Луганск», — удакладніў французскі журналіст.

«Слухайце, гэта ўжо не абмяркоўваецца. Можна было гаварыць у лютым-сакавіку пра гэта. Разумееце, там жывуць рускія людзі, якіх украінцы трэціравалі. А навошта? Я ж палякаў цяпер не караю за тую палітыку, якую праводзіць Польшча ў адносінах да нас. Я заўсёды кажу: у нас ёсць палякі этнічныя, але гэта «мае» палякі. Яны маюць усе правы, як і беларусы. Мы іх любім, паважаем і цэнім. І яны сябе паводзяць годна ў асноўным. Навошта тады было рускую мову забараняць, навошта было ўнутры Украіны праводзіць тую палітыку, якую праводзілі Парашэнка, Зяленскі? Яны ж увесь час знутры штурхалі Украіну гэтым самым да вайны», — заявіў Прэзідэнт.

Але галоўнае, падкрэсліў ён, ніхто не дае Расіі гарантый бяспекі, таго, што ёй не пагражае агрэсія з тэрыторыі Украіны. «Вам, натаўцам і амерыканцам, патрэбна была вайна, і вы рабілі ўсё да дробязяў, каб гэту сітуацыю стварыць, каб падштурхнуць да гэтага», — падсумаваў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка выказаў думку аб тым, што апошнія гады на Украіне складваліся ўнутраныя прычыны для абвастрэння адносін з Расіяй. Як прыклад, ён прывёў наўмыснае абмежаванне выкарыстання рускай мовы, абразы і дэманізацыю кіраўніцтва Расіі. «Там былі ўнутраныя прычыны для таго, каб Расія, груба кажучы, паставіла Украіну на месца. Навошта вы абражалі ўладу ў Расіі? Навошта вы Прэзідэнта Пуціна абражалі? Макрона яны ж так не крытыкавалі, хоць было за што. Калі Байдэн паднімаўся па трапе і ўпаў, у нас у Беларусі ніхто з гэтага не смяяўся. Усякае бывае. А вы што рабілі і робіце супраць Пуціна? Навошта вы яго дэманізуеце, навошта вы яго абражаеце? Гэта значыць таксама нядобры фон. Можа, гэта не прычына для аперацыі, але фон нядобры», — адзначыў ён.

***

Журналіст спытаў у Аляксандра Лукашэнкі, як доўга ён плануе заставацца на пасадзе кіраўніка дзяржавы. На што Прэзідэнт адказаў, што такое рашэнне прымае не ён асабіста, а беларускі народ. «Я, можа быць, даўно б адышоў ад улады, калі б пэўная сітуацыя была ў краіне і за яе межамі. А вось многія з 2020 года, якія, як вы кажаце, выйшлі на вуліцы, сёння апрытомнелі, зразумелі, што магло быць, і кажуць: «Дык мы ж няправільна зрабілі. А калі б яго не было, што б было?» Так людзі кажуць. Паверце, я ведаю настрой людзей. Калі б я ў 2020 годзе ўсё кінуў і пайшоў? Сёння краіна была б іншая і інтэрв'ю вы б бралі ў іншых людзей. І палітыка была б іншая. Сёння было б у Беларусі горш, чым ва Украіне. Прабачце за нясціпласць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Валерыя СЦЯЦКО.

Сацыяльны вектар

КОЖНАЯ АСОБА — КАШТОЎНАЯ

У Савеце Рэспублікі абмеркавалі пытанні сацыяльнай адаптацыі дзяцей з расстройствамі аўтыстычнага спектра

Нарада праходзіла на чале са Старшынёй Савета Рэспублікі Наталляй КАЧАНАВАЙ. Абмяркоўваліся пытанні стварэння ўмоў для навучання, рэабілітацыі, сацыяльнай адаптацыі і фізічнага развіцця дзяцей з расстройствамі аўтыстычнага спектра. У Рэспубліцы Беларусь у цяперашні час пад назіраннем урача-псіхіятра-нарколага з прычыны РАС знаходзіцца 2770 дзяцей, іх колькасць расце. Па сусветных навуковых даных, распаўсюджанасць РАС складае 1 выпадак на 160 нованароджаных. Як адзначыла Наталля Качанава, прычынай правядзення нарады паслужылі звароты ў Савет Рэспублікі бацькоў такіх дзяцей:

— У Беларусі дзеці — прыярытэт сацыяльнай палітыкі, у гэтым няма ніякага сумнення. Усё, што робіцца ў краіне і заканадаўча ўрэгулявана, вартае павагі. Гэта навучанне, лячэнне дзяцей, цэнтры карэкцыйнага развіцця, якія ёсць у кожным горадзе і раёне. Гэта тая дапамога, якая аказваецца дзяржавай сем'ям, што выхоўваюць такіх дзяцей. Але разам з тым пры абмеркаванні пытанняў з бацькамі мы бачым, што не заўсёды на месцах гэта вырашаецца так, як трактуе наша заканадаўства і як павінна быць выбудавана гэтая работа. Не заўсёды настаўнікі гатовыя працаваць з такімі дзецьмі, — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі.

Адзін з асноўных пасылаў, які выказваўся ўдзельнікамі нарады, — неабходна больш актыўна інтэграваць такіх дзяцей у грамадства:

— Яны павінны вучыцца ў звычайнай школе, атрымліваць адукацыю і ў далейшым быць інтэграваныя ў соцыум. Яны павінны разам з намі жыць і працаваць, адчуваць сябе камфортна і прыносіць карысць краіне, — падкрэсліла Наталля Качанава.

Акрамя таго, спікерамі выказвалася меркаванне, што некаторыя з настаўнікаў не маюць неабходных ведаў і вопыту, каб працаваць з дзецьмі, якія маюць расстройствы аўтыстычнага спектра. Дадзены аспект таксама патрабуе вырашэння.

Міністр аховы здароўя Дзмітрый ПІНЕВІЧ адзначыў, што актуальнасць праблемы будзе толькі ўзрастаць — за апошнія пяць гадоў агульная колькасць дзяцей з расстройствамі аўтыстычнага спектра, якія знаходзяцца пад назіраннем спецыялістаў, вырасла ў 2,4 раза.

— З улікам зменených сусветных падыходаў да вядзення і лячэння пацыентаў з РАС распрацаваны змяненні ў існуючыя клінічныя пратаколы дыягностыкі і лячэння пацыентаў з псіхічнымі і паводзінскімі расстройствамі (дарослае і дзіцячае насельніцтва). Прынята рашэнне аб перапрафіляванні Рэспубліканскага дзіцячага цэнтра медыцынскай рэабілітацыі для аказання рэабілітацыйнай дапамогі дзецям з РАС і іншымі псіхічнымі расстройствамі, — дадаў міністр.

У сваю чаргу, **міністр адукацыі Андрэй ІВАНЕЦ** паведаміў, што каля 15 % дзяцей з аўтызмам атрымлівае агульную сяраднюю адукацыю ў звычайных групах і класах і пры неабходнасці — карэкцыйна-педагагічную дапамогу. Каля 10 % навучэнцаў па медпаказаннях атрымлівае адукацыю дома. Астатнія атрымліваюць спецыяльную адукацыю ва ўстановах спецадукацыі:

— Сёлета прайшлі два семінары па гэтай праблематыцы. Мы запрашаем грамадскія арганізацыі, тобок тых людзей, якія кожны дзень сутыкаюцца з гэтымі пытаннямі. Семінары дазваляюць распрацоўваць нарматыўна-прававое забеспячэнне міжведамаснага ўзаемадзеяння ў галіне інклюзіі на ўсіх этапах, — адзначыў Андрэй Іванец.

Ва ўстановах адукацыі краіны ўведзена больш за 1300 штатных выхавальнікаў дашкольнай адукацыі, а таксама выхавальнікаў, якія ажыццяўляюць персанальнае суправаджэнне дзяцей з аўтызмам.

— Ідэя інклюзіўнага грамадства базіруецца на разуменні кожным грамадзянінам важнасці і каштоўнасці асобы кожнага чалавека, — адзначыла **Вера ХІТРУК, дырэктар Інстытута інклюзіўнай адукацыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка.** — Культура такога кшталту выбудоўваецца гадамі. Гаворка ідзе аб паступовым, мэтанакіраваным выхаванні кожнага чалавека, пачынаючы з моманту яго нараджэння. Гэта датычыцца не толькі ўрачоў або педагогаў, але кожнага з нас.

Арына КАРПОВІЧ.

Блізкая ўлада

Дэбюракратызацыя, стан дарог і «Адно акно»

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА наведаў Дзяржынскі раён. Ён азнаёміўся з жыллёвым будаўніцтвам і добраўпарадкаваннем Фаніпаля, горада-спадарожніка Мінска, у якім пражываюць 18 тысяч жыхароў. Кіраўнікі Дзяржынскага раёна расказалі аб перспектывах будаўніцтва сацыяльна важных аб'ектаў: дзіцячага садка, фізкультурна-аздараўленчага цэнтра, яшчэ адной школы, асфальтавання дарог. «Павінна быць дакладнае партнёрства паміж уладай і грамадзянамі, якія пражываюць у тым ці іншым рэгіёне. Улада робіць сваю работу, але і людзі павінны ўносіць свой уклад і падтрымліваць у дастойным стане сваю тэрыторыю», — сказаў Ігар Сергеенка.

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта падкрэсліў, што паездкі ў рэгіёны накіраваны ў тым ліку на кантроль за выкананнем Дырэктывы аб дэбюракратызацыі дзяржаўнага апарату. Дырэктыва працуе, а кантроль за яе выкананнем ускладзены на Адміністрацыю Прэзідэнта. «Літаральна месяц таму праходзіў рэспубліканскі семінар, на якім абагульняўся вопыт работы не толькі па дырэктыве, але і вопыт розных формаў работы на мясцовым узроўні. Гэта і работа са зваротамі грамадзян, і выкананне адміністрацыйных працэдур, і рэалізацыя розных сацыяльных праграм. Нашы паездкі ў рэгіёны накіраваныя ў тым ліку і на тое, каб паглядзець, як рэалізоўваюцца тыя ідэі і рашэнні, якія былі выпрацаваны падчас правядзення рэспубліканскага семінара», — падкрэсліў ён. Па словах Ігара Сергеенкі, такія рабочыя паездкі паказваюць, як удасканаліць дырэктыву, чым яе дапоўніць і як развіваць. Ён расказаў, што цяпер вядзецца вялікая работа па ўдасканаленні дырэктывы.

Таксама Ігар Сергеенка ўзяў удзел у адкрыцці абноўленага памяшкання службы «Адно акно» ў Дзяржынскім райвыканкаме. Тут створаны дастойныя неабходныя ўмовы для работы са зваротамі грамадзян і правядзення адміністрацыйных працэдур.

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта таксама правёў у Дзяржынскім райвыканкаме прыём грамадзян, падчас якога было ўзнята дастаткова шмат пытанняў. Па словах Ігара Сергеенкі, значная колькасць тэм разглядаецца на мясцовым узроўні раённым выканаўчым камітэтам. Прымаюцца меры, пытанні здымаюцца. «Асаблівасць сённяшняга прыёму заключаецца ў тым, што практычна 90 працэнтаў узнятых пытанняў датычыліся дарожнага будаўніцтва, уладкавання мастоў, пешаходных пераходаў, асфальтавання, грэйдзіравання — адным словам, стану дарог. У час размовы з кіраўніцтвам райвыканкама я ўбачыў, што тэма для Дзяржынска актуальная. Напэўна, нават у большай ступені, чым для Дзяржынскага раёна», — сказаў ён. Па словах кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, кіраўніцтвам Дзяржынскага раёна распрацавана праграма па вырашэнні гэтай праблемы. «Трэба сказаць, што прыкладна 50 % дарог у самім Дзяржынску не маюць асфальтавага пакрыцця і патрабуюць пастаяннага догляду. Людзі ставяцца з разуменнем да таго, што іх пытанне не можа быць вырашана імгненна, а будзе ўключана ў праграму на наступны год. Былі і калектыўныя звароты. Па кожным з іх былі дадзены тлумачэнні. Частка праблем вырашана, частка будзе вырашацца ў найбліжэйшай будучыні», — заявіў Ігар Сергеенка.

Паводле БелТА.

ВЫКАНКАМЫ НА СУВЯЗІ

Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай «вертыкаллю» працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.

Тэлефонныя лініі ў суботу, 23 ліпеня, з 9.00 да 12.00 правядуць:

- намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Вадзім Іванавіч АЛЬШЭЎСКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;
- намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Анжаліка Аляксандраўна НІКІЦІНА. Тэл. 8 021 222 22 22;
- кіраўнік спраў Гомельскага аблвыканкама Алена Уладзіміраўна КЛІЧКОЎСКАЯ. Тэл. 8 023 233 12 37;
- намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Іосіфавіч ДЗЯШКО. Тэл. 8 015 273 56 44;
- намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Генадзь Іванавіч ДЗЕНГАЛЁЎ. Тэл. 8 022 250 18 69;
- намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Іван Станіслававіч МАРКЕВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;
- кіраўнік спраў Мінскага гарвыканкама Ганна Мар'янаўна МАТЭЛЬСКАЯ. Тэл. 8 017 222 44 44.

«Момант ісціны» для абітурыентаў

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«З улікам агульнай тэндэнцыі змяншэння ў апошнія гады колькасці абітурыентаў можна адзначыць істотны рост колькасці тых, хто абраў для выпрабаванняў матэматыку і фізіку, і змяншэнне колькасці абітурыентаў, якія выбралі біялогію, гісторыю Беларусі, грамадазнаўства і сусветную гісторыю, — паведаміла Таццяна Уласенка. — Па выніках папярэдняга аналізу вынікаў выканання тэстаў 2022 года ўстаноўлена, што ўдзельнікі ЦТ па ўсіх прадметах паказалі прыкладна такія ж вынікі, як і ў папярэднім годзе. Аб'ектыўна складанасць тэста не ўзрасла. Увесь тэставы матэрыял, які быў прапанаваны для правядзення ЦТ, праходзіў шматразовую экспертызу: як унутраную, так і знешнюю».

Самыя масавыя прадметы — рускую мову і матэматыку — абітурыенты здавалі два дні. Сярэдні тэставы бал абітурыентаў, якія пісалі ЦТ па рускай мове ў першы дзень, — 53,14, у другі дзень — 52,44. На ЦТ па матэматыцы сярэдні бал у першы дзень — 49,64, у другі — 49,3. Па словах арганізатараў ЦТ, такая статыстыка сведчыць, што ўсе абітурыенты, нягледзячы на тое ў які дзень яны здавалі тэсціраванне, былі ў роўных умовах.

Усе тэсты распрацоўваліся на аснове дзеючых навучальных праграм. Да работы па падрыхтоўцы тэставых матэрыялаў для ЦТ 2022 года супрацоўнікі Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў традыцыйна прыцягвалі высокакваліфікаваных спецыялістаў:

Уладальніца трох стабальных сертыфікатаў Настасся БІЛЬДЗЬ месцам навучання абрала БДУІР.

настаўнікаў-метадыстаў, настаўнікаў-практыкаў, аўтараў навучальных дапаможнікаў. Гэта дазваляе забяспечваць якасць навучальных матэрыялаў і адпаведнасць патрабаванням навучальных праграм.

«Інстытут кантролю ведаў усебакова вывучаў пытанне, колькі ж часу насамрэч патрабуецца абітурыентам на выкананне тэстаў па фізіцы і матэматыцы. Да гэтай работы прыцягваліся педагогі-практыкі з усіх рэгіёнаў краіны. Аналіз экспертнай ацэнкі паказаў наяўнасць у тэстах пэўных заданняў, для вырашэння якіх абітурыенты могуць выкарыстоўваць не толькі рацыянальныя спосабы рашэння, але і шматкроакавыя, таму было прынята рашэнне павялічыць працягласць часу на цэнтралізаваным тэсціраванні па матэматыцы і фізіцы на 30 хвілін, — дадала Таццяна Уласенка. — Аналіз вынікаў сведчыць, што тэсты на ЦТ даступныя для навучэнцаў усіх устаноў адукацыі, хоць найлепшыя вынікі ўсё ж такі дэманструюць выпускнікі гімназій і ліцэяў. Яны маюць перавагу перад выпускнікамі сярэдніх школ у сярэднім у 10-12 балаў. І яшчэ большую перавагу — перад выпускнікамі сярэдніх спецыяльных і прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў».

Графік прыёмных камісій ССНУ

18 ліпеня ў краіне стартаваў прыём дакументаў у ВНУ, а 20 ліпеня адкрылі свае дзверы для абітурыентаў прыёмныя камісіі сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. У ССНУ на базе 9 класаў дакументы ў абітурыентаў будуць прымаць да 3 жніўня. Гэта датычыцца тых, хто паступае на навучанне за кошт сродкаў бюджэту, і тых, хто будзе здаваць уступныя іспыты, напрыклад, па спецыяльнасцях профілю «мастацтва». У тых, хто паступае на платнай аснове без уступных іспытаў, прымаць дакументы будуць да 14 жніўня.

Прыём дакументаў на аснове агульнай сярэдняй адукацыі за кошт сродкаў бюджэту і для тых, хто здае ўступныя іспыты па спецыяльнасці, будзе праходзіць да 12 жніўня, а на платнай аснове без уступных іспытаў — да 17 жніўня.

Начальнік упраўлення прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі Аляксандра ПЯТРОВА расказала, што сёлета ў ССНУ з'явіцца шэраг новых спецыяльнасцяў. Напрыклад, у Мінскім гарадскім педагагічным каледжы і Ваўкавыскім каледжы ГрДУ імя Я. Купалы адкрыта новая спецыяльнасць «педагагічнае суправаджэнне». Яна скіравана перш за ўсё на суправаджэнне дзяцей з асаблівымі патрэбамі ў адукацыйным працэсе.

У Мінскім дзяржаўным архітэктурна-будаўнічым каледжы — філіяле БНТУ адкрываецца спецыяльнасць «архітэктурны дызайн гарадскога асяроддзя». У філіяле БДТУ «Беларускі дзяржаўны каледж прамысловасці будаўнічых матэрыялаў» — спецыяльнасць «абслугоўванне сістэм водападрыхтоўкі і водаачысткі».

Традыцыйна высокім попытам у абітурыентаў карыстаюцца профілі «мастацтва», спецыяльнасці, звязаныя з інфармацыйнымі тэхналогіямі, педагогікай, аховай здароўя. «Трэнд захоўваецца з году ў год. Мы чакаем, што гэтыя спецыяльнасці застануцца ў лідарах і ў бягучым годзе», — падкрэслівае Аляксандра Пятрова.

Абітурыенты, якія паступаюць на аснове агульнай базавай адукацыі, залічваюцца па конкурсе сярэдняга бала пасведчання аб агульнай базавай адукацыі. Залічэнне на аснове агульнай сярэдняй адукацыі пройдзе па конкурсе агульнай сумы балаў двух ЦТ і сярэдняга бала дакумента аб адукацыі.

60 хвілін «цішыні»

Гарачы час сёння і для прыёмных камісій ВНУ. З 18 да 24 ліпеня вызначыцца з выбарам спецыяльнасці павінны ўсе абітурыенты, якія прэтэндуюць на бюджэтныя месцы, а таксама абітурыенты, якія паступаюць на платную форму навучання на спецыяльнасці, дзе прадугледжаны ўступныя іспыты.

Для некаторых катэгорый абітурыентаў тэрміны падачы дакументаў іншыя. Так, з 18 да 26 ліпеня будуць прымаць дакументы ад тых, хто паступае на спецыяльнасці сельскагаспадарчага профілю на дзённае аддзяленне (бюджэтную форму), у Ваенную акадэмію, Інстытут пагранічнай службы, а таксама на ваенныя факультэты (на бюджэт).

Як расказаў **начальнік галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі Міністэрства адукацыі Сяргей КАСПЯРОВІЧ,** назіраць за ходам падачы дакументаў у прыёмныя камісіі можна анлайн. Раней дыяпазон колькасці набраных балаў, заяўленых абітурыентамі ў прыёмную камісію, складаў 10, напрыклад 301—310, 311—320 і гэтак далей. Цяпер гэты дыяпазон звузіўся да пяці балаў. Так абітурыентам значна прасцей ацаніць свае шанцы на паступленне, бо пры залічэнні мае значэнне нават адзін бал. Інфармацыя аб ходзе падачы дакументаў абнаўляецца кожныя тры гадзіны, а ў некаторых універсітэтах — у рэжыме рэальнага часу. Апошняе абнаўленне ў дзень закрыцця прыёмных камісій адбудзецца ў 17 гадзін. Такім чынам, у абітурыентаў будзе яшчэ гадзіна, каб сарыентавацца і падаць дакументы туды, дзе ім гарантавана хоць балаў.

Надзея НІКАЛАЕВА.
Фота прэс-службы БДУІР.

Кантэкст

КРЫМІНАЛЬНАЕ ЧЫТВО

Як ІКАО перакваліфікавалася на другасортныя шпіёнскія раманы

У Міжнароднай арганізацыі грамадзянскай авіяцыі (ІКАО) днямі былі разгледжаны два пытанні — па інцыдэнце з рэйсам Ryanair у небе над Беларуссю 23 мая 2021 года, а таксама скарга Беларусі на дзеянні шэрагу еўрапейскіх дзяржаў, якія ўвялі санкцыі ў дачыненні да грамадзянскай авіяцыі нашай краіны. Абмяркоўвалася справаздача арганізацыі па гэтым інцыдэнце. Вынік у чарговы раз падкрэсліў залежнасць, прадузятасць і палітызаванасць ІКАО.

НЕ ВЫТРЫМЛІВАЕ КРЫТЫКІ

Справаздача ІКАО па інцыдэнце з рэйсам Ryanair не вытрымлівае ніякай крытыкі. Аб гэтым заявіў **дырэктар дэпартамента па авіяцыі Міністэрства транспарту і камунікацый Арцём СІКОРСКІ,** паведаміла БелТА. Гэты даклад катэгарычна непрымальны і дыскрэдытуе ІКАО як міжнародны тэхнічны орган, што займаецца грамадзянскай авіяцыяй. «Мы катэгарычна з ім не пагадзіліся. Афіцыйны прадстаўнік РФ, член Савета ІКАО таксама не пагадзіўся з гэтай справаздачай, указаў на шэраг памылак, недакладнасцяў, неабвяцыйных, неаб'ектыўных падыходаў. Ва ўсіх дакументах ІКАО напісана, што любое расследаванне праводзіцца не для таго, каб знайсці вінаватых, а каб выключыць падобныя падзеі ў будучыні. Цяпер пагрозу авіяцыйнай бяспецы стварае так званы тэлефонны экстрэмізм, і гэта аб'ектыўная праблема, якой ІКАО павінна займацца», — сказаў Арцём Сікорскі.

Справаздача была падрыхтавана яшчэ ў студзені гэтага года. Яна ўтрымлівала галоўны пастулат, што ніякага перахвату паветранага судна не было. «Аднак на той момант гэтая справаздача не задаволіла шэраг заходніх краін, і пад іх ціскам групе ІКАО было даручана асвятліць усе так званыя прабелы ў гэтым пытанні. Аднак група ІКАО не запытала ў Беларусі ніякай дадатковай інфармацыі. Пры гэтым у канчатковай справаздачы, якая катэгарычна не прынятая Беларуссю, узніклі новыя даныя. Як заявіла група ІКАО, пры садзейнічанні ЗША і Польшчы ім удалося атрымаць даныя ад дыспетчара (прозвішча якога не прыводзіцца). Пасля гэтага справаздача стала больш нагадваць крымінальнае чытво — другасортны шпіёнскі раман», — заявіў дырэктар дэпартамента.

«Многія рэчы не паддаюцца крытыцы. Напрыклад, нібыта ў дыспетчара быў тэлефон, на якім ён уключыў дыктафон, не вымаючы з кішэні. Пры гэтым трэба разумець, што тэлефон можа ўносіць перашкоды ў работу складаных тэхнікі, плюс пытанне бяспекі — дыспетчар не павінен адцягвацца на тэлефон, праносіць яго забаронена. Гэта далёка ад праўды, ад авіяцыйнай тэхналогіі і больш нагадвае выдумку, каб неяк абвінаваціць Беларусь», — падкрэсліў Арцём Сікорскі.

Прадстаўнікі Беларусі і Расіі ўсумніліся ў тым, што запіс сапраўдны. «На гэта ў ІКАО сказалі, што ў іх няма грошай, каб пераканацца ў сапраўднасці запісу. Але яны вераць Польшчы і ЗША на слова», — абурыўся дырэктар дэпартамента. Заходнія краіны аднагалосна падтрымалі абвінавачанні супраць Беларусі. «Хоць у чым нас абвінавачваюць — складана зразумець. Меў месца факт іржывага паведамлення, якое змяшчалася ў лісце, даведзеным да экіпажа паветранага судна. Пілот павінен быў рухацца на найбліжэйшы аэрадром. У той момант гэта быў Вільнюс. Ляцець у Мінск было яго рашэннем», — звярнуў увагу Арцём Сікорскі.

СІЛА — У ПРАЎДЗЕ

Беларусь мае намер жорстка адстойваць нацыянальныя інтарэсы ў сферы грамадзянскай авіяцыі, заявіў дырэктар дэпартамента па авіяцыі Міністэрства транспарту і камунікацый. «Быў падрыхтаваны рабочы дакумент са скаргай на дзяржавы, якія незаконна, парушаючы Чыкагскую канвенцыю, блакіруюць нашым авіякампаніям, нашым пасажырам доступ да паветранай прасторы Еўропы і іншых краін, закрываюць для нас аэрапорты. Таксама замежным перавозчыкам рэкамендавана пазбягаць паветранай прасторы Беларусі, хоць бяспека паветранай навігацыі нават у гэтай справаздачы не выклікае сумнення. У ходзе гэтага разгляду была цудоўна прадэманстравана пазіцыя Захаду. Калі мы прадставілі рабочы дакумент, заходнія краіны адразу заклікалі прэзідэнта Савета ІКАО не прымаць ніякіх рашэнняў і ігнараваць. Прадстаўнік ЗША адкрыта заявіў, што меры па блакіраванні — гэта помста Захаду», — сказаў Арцём Сікорскі.

Беларускі бок падкрэсліў, што такія выразы непрымальныя, а таксама звярнуў увагу, што санкцыі не могуць мець кропкавы характар, у любым выпадку пацерпяць звычайныя людзі. «Дык чым тады займаецца ІКАО? Садзейнічае таму, што пад дудку заходніх краін людзей пазбаўляюць права на свабоду перамяшчэння? У чым вінаватыя беларускія авіякампаніі? А за што караюць еўрапейскіх перавозчыкаў, якім не дазваляюць палёты праз Беларусь?» — задаў пытанні дырэктар дэпартамента.

«Гэта быў раскольны момант. Пасля нашу пазіцыю падтрымалі Кітай, Расія, ПАР, Індыя і многія іншыя краіны. У выніку прэзідэнт Савета ІКАО не змог лёгка зняць гэту скаргу, і яны будуць вымушаныя яе разглядаць. Мы будзем жорстка адстойваць нашы нацыянальныя інтарэсы», — адзначыў Арцём Сікорскі.

Раней Расія заявіла аб недапушчальнасці выкарыстання абмежаванняў у сферы грамадзянскай авіяцыі ў палітычных мэтах. Аб гэтым паведаміла афіцыйны прадстаўнік МЗС Расіі Марыя Захарава. Яна падкрэсліла, што «ператварэнне міжнароднай грамадзянскай авіяцыі ў інструмент палітычнага і эканамічнага ціску з'яўляецца нічым іншым, як абуральным злоўжываннем нормамі міжнароднага паветранага права, уключаючы шэраг палажэнняў Канвенцыі аб міжнароднай грамадзянскай авіяцыі 1944 года, а таксама двухбаковых пагадненняў аб паветраных зносінах».

ДЗЕЯННІ СПЕЦСЛУЖБАЎ

Гэта дзеянні заходніх спецслужбаў, заявіў **палітолаг Пётр ПЯТРОЎСКІ.** «Нагадаю, што гэта расследаванне праходзіць ужо больш за год. І ўвесь гэты час нас кармілі абяцанкамі, што вось-вось яны апублікуюць справаздачу. Мы памятаем, як у лістападзе яны гэта гаварылі, у снежні, потым у лютым. І вось нарэшце яны прачнуліся, і іх высновы процілеглыя зместу іх расследавання. Гэта значыць фактаў парушэння ні міжнароднага права, ні нейкіх абавязацельстваў Рэспублікай Беларусь не выяўлена. Усе гэтыя абвінавачанні з'яўляюцца надуманымі і палітызаванымі. Іх трэба разглядаць у кантэксце ўсё большага геапалітычнага процістаяння. Асабліва таго, што калектыўны Захад не хоча адмаўляцца ад свайго панавання і фактычна вельмі нервова рэагуе на тыя геапалітычныя правалы, якія маюць месца быць, на пагаршэнне ўласнага становішча, страту дамінавання ва ўсім свеце, пакіданне першага радка. Таму такія раптоўныя заявы, калі ўжо столькі часу мінула, сведчаць аб тым, што тут не больш чым барацьба за сваё геапалітычнае панаванне. І ў такой барацьбе нават інструменты хлусні, маніпуляванне выкарыстоўваюцца калектыўным Захадам», — адзначыў БелТА Пётр Пятроўскі.

Палітолаг упэўнены: рана ці позна мы даведаемся пра рэальных заказчыкаў гэтых правакацый. «Асабліва пасля таго, як калектыўны Захад канчаткова страціць сваё першынство, калі сфарміруюцца новыя правілы міжнародных адносін, дзе будзе замацавана шматпалярнасць, — тады, я думаю, сусветная супольнасць правядзе нямала розных расследаванняў па такіх вось дзеяннях і справах. Пакуль я бачу, што гэта дзеянні заходніх спецслужбаў. Іх мэтай з'яўляецца інфармацыйная дыскрэдытацыя Рэспублікі Беларусь, падбухторванне некаторых элементаў дэструктыўнай дзейнасці ўнутры нашай краіны, — заўважыў палітолаг. — Але, як мы бачылі на працягу двух гадоў, пакуль гэта ім не ўдавалася. Думаю, што не ўдасца».

Пётр ДУНЬКО.

«ТАВАРЫСТВА ПАДОБНАЕ НА КАРАБЕЛЬ. КРУТА ПАВАРОЧВАЦЬ ЯГО НЕ ЗБІРАЮСЯ»

Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

Зарыбленне беларускіх вадаёмаў — пастаянны клопат БТПР.

«Жанчыны лепш стрымліваюць эмоцыі. І дыхаюць»

У пачатку інтэрв'ю прызналася Ігара Шуневічу, што рыхтавалася да размовы. «Можа, і ў Беларускае таварыства паляўнічых і рыбаловаў уступілі?» — спытаў ён.

— Не, — прыйшлося прызнавацца далей. ***— Наўрад ці змагла б стаць паляўнічым.***

— Неабавязкова ж паляўнічым, — заўважыў суразмоўнік. — Можна і рыбаловам стаць.

— Ну, рыбаловам... — сумелася, не ведаючы, ці варта прызнавацца ў тым, што ем рыбу і мяса з задавальненнем, а вось здабываць...

— Можна заняцца стэндавай стральбой з паляўнічай стрэльбы, — прапанаваў генерал.

— Стэндавая... — задумалася я, бо чула, што стральба ў ціры мае псіхатэрапеўтычны эфект. ***— Трэба паспрабаваць!***

— Падумайце!

— Ведаю, што ў вас нешта для жанчын спецыяльнае створана.

— Для жанчын у нас усё, — запэўніў кіраўнік аб'яднання беларускіх паляўнічых і рыбаловаў. — Мы ўвогуле дзеля жанчын усё робім. Навошта на паляванне мужчына хадзіў? Каб не проста накарміць жанчыну, але і ўразіць яе. А калі сур'ёзна, мы сёлета перафармаціравалі рэспубліканскія спаборніцтвы па стралкова-паляўнічым спорце, увялі новую канкурэнтную групу для жанчын. Жанчыны — члены БТПР бяруць удзел нараўне з мужчынамі, але пакуль толькі ў дысцыпліне «стэндавая стральба». Вырашалі пачаць з яе, потым плануем дапусціць жанчын і да іншых дысцыплін. Дзеці, дарэчы, таксама ўдзельнічаюць у спаборніцтвах — у стральбе з пнеўматычнай зброі.

— У гэтым наспела патрэба?

— Вядома. Мая мара — стварыць жаночы паляўнічы клуб. Бачу ў гэтым папулярызацыю нашай грамадскай арганізацыі. Хачу пераадолець тэндэнцыю да змяншэння яе членаў. Ёсць некалькі шляхоў, у тым ліку заваяванне жаночай часткі грамадства. Калі жанчыны захопяцца паляваннем ці рыбалкай, то і мужчын адпускаць будуць лягчэй, ды і колькасць членаў таварыства вырасце. Дзяцей больш ахвотна прывядуць сюды. У рабоце з падлеткамі мы ідзём па шляху не толькі і не столькі паляванне і рыбалкі, колькі экалагічнай адукацыі. Хочам уклініцца ў навучальны працэс. Прапануем Міністэрству адукацыі, каб прадстаўнікі таварыства прысутнічалі ў кожнай школе, асабліва вясковай, у якасці настаўнікаў дысцыпліны аб правільным і гарманічным знаходжанні ў прыродзе. Гаворка пра навыкі бяспечных паводзін, аказання першай дапамогі, арыентавання, гарманічнага суіснавання з прыродай. Паляванне і рыбалка прыйдуць потым, і не для ўсіх. Але гэтыя навыкі патрэбныя ўсім. Стральба — адзін з элементаў такога працэсу, не самы галоўны, але самы цікавы для тых жа падлеткаў.

— У савецкіх школах старшакласнікаў вучылі абыходзіцца са зброяй.

— Я казаў міністру адукацыі, што мы можам паўдзельнічаць у аднаўленні курса агнявой падрыхтоўкі старшакласнікаў. Лічу, што любыя віды стральбы садзейнічаюць больш арганічнаму развіццю чалавека.

— Якім чынам?

— Што такое стральба як феномен? Гэта не проста спорт. Гэта занятак, які, па-першае, дысцыплінуе. Хто самы законаслухмяны ў краіне? Паляўнічыя. Бо правапарушэнні цягнуць адкліканне ліцэнзіі і канфіскацыю зброі. Чалавек, які валодае добрай зброяй, вельмі асцерагаецца парушыць закон у любой форме, бо тады пазбавіцца дарагіх для яго прадметаў і заняткаў. Стралковая падрыхтоўка ўключае правілы бяспекі, навучанне адказнасці, канцэнтрацыі, фізічную падрыхтоўку, работу мозга і шмат што яшчэ.

— Жанчыны падчас стральбы адрозніваюцца ад мужчын?

— Як і ва ўсім астатнім. Жанчыны ёсць розныя. Адны хуткa схопліваюць, ім дастаткова паказаць адзін-два разы. Іншыя рухаюцца наперад павольна, але ўпэўнена. Абодва варыянты добрыя. Вынік адзін, і ён заўсёды лепшы, чым у мужчын.

Фота БелТА.

Вывучка выжлаў.

— Чаму?

— Жанчыны больш адказныя і ў іх іншая фізіялогія. Яны здольныя лепш стрымліваць эмоцыі, лепш сябе кантралююць. У вас лепш атрымліваецца правільна дыхаць. Вы дыхаеце як жабкі — спакойна, павольна, усімі грудзямі.

«Мне падаецца вельмі спрэчнай ідэя закопваць у зямлю сотні тон добрага прадукту»

— Гэтым летам уступаюць у сілу новыя нормы ў паляванні і рыбалоўстве. Што сярод змяненняў самае асноўнае?

— Мы прыводзім у парадак сферу падводнага палявання. Раней гэты від дзейнасці быў недастаткова ўрэгуляваны, нягледзячы на тое, што ён складаны і небяспечны. Падводная стрэльба мае сур'ёзныя паражаючыя элементы. Рэестр падводных паляўнічых ужо створаны, выдаём пасведчанні. На сёння зарэгістравана 1300 падводных паляўнічых, сярод іх пяць жанчын. Штодня падпісваю новыя дакументы, дынаміка звяротаў не зніжаецца, некаторыя скардзяцца на тэрміны, але прашу аднесціся з разуменнем: гэта новая справа для таварыства і мы самі зацікаўленыя хутчэй завяршыць работу, каб у людзей у цёплую пару года была магчымасць рэалізаваць сваё хобі.

— Прыкладна месяц назад вы дакладвалі кіраўніку дзяржавы аб стане спраў у Беларускім таварыстве паляўнічых і рыбаловаў. Якія першыя вынікі гэтай размовы?

— З усяго пераліку дакументаў, які я пакінуў Прэзідэнту, два ўжо знаходзяцца на разглядзе ў дзяржаўных органах з адпаведнымі рэзалюцыямі. Першы датычыцца палявання на дзіка ў сувязі з праблемай афрыканскай чумы свіней. Урад па маёй ініцыятыве прапанаваў змяніць алгарытм адабрання гэтага звера з дзікай прыроды. Лічу мэтазгодным дазволіць паляўнічым забіраць дзіка сабе, як гэта было і раней. Цяпер ён утылізуецца незалежна ад таго, хворы ці здаровы. Паляўнічаму за гэта яшчэ выплачваюцца грошы, што для бюджэту нявыгадна. Мая ідэя — зрабіць дакладна наадварот: няхай паляўнічы плаціць невялікія грошы (1-2 базавыя велічыні) і забірае сабе трафей. Гэта дазволіць значна зменшыць пагалоўе дзікоў, бо з'явіцца матывацыя на іх паляваць. Будзе эканамічна выгадна дзяржаве. Мне падаецца вельмі спрэчнай ідэя закопваць у зямлю сотні тон добрага прадукту ды яшчэ траціць на гэта грошы. Дакумент, які ўтрымлівае прапанову змяніць алгарытм адабрання дзікоў, разгледжаны, па ім прынята станоўчае рашэнне, ва ўрадзе ўжо рыхтуецца новы заканадаўчы акт. Плануем, што з 1 кастрычніка адпаведныя змяненні ўступяць у сілу.

Другі дакумент унутраны. Ён датычыцца рэструктурызацыі нашага аб'яднання. Я далажыў кіраўніку дзяржавы наша бачанне, якім павінна быць таварыства. Сёння гэта вельмі складаная субстанцыя з трохузроўневай сістэмай кіравання, з шэрагам органаў, якія не функцыянуюць. Прапанаваў спрасціць і наблізіць непасрэдна да патрэб паляўнічых. Справа ў тым, што БТПР цяпер у некаторых раёнах асацыіруецца са структурай, ледзь не антаганістычнай паляўнічаму. Адсюль ніжэйшая даступнасць палявання, скаргі...

Я прапанаваў сістэму кіравання зрабіць двухузроўневай: рэспубліка і вобласць. Каб у раёне самым галоўным быў паляўніцтвазнавец і прафесійныя егеры. Дарэчы, мы — грамадская арганізацыя і маглі б не пытацца дазволу на сваю рэструктурызацыю ў кіраўніка дзяржавы. Але, па-першае, гутарка ўзнікла сама сабой. Па-другое, для мяне важная падтрымка Прэзідэнта, бо арганізацыя вялікая і аптымізацыя яе структуры закране людзей. Мы, вядома, усіх сваіх супрацоўнікаў цэнім і паважаем, і дадзім магчымасць новага працаўладкавання кожнаму, чыя пасада будзе ліквідаваная.

— Ці чакаюцца змяненні для ўладальнікаў паляўнічых сабак?

— Адна з дзяржаўных задач таварыства — развіццё паляўнічага сабакаводства. Нашы планы па змяненні існуючага стану спраў у паляўнічай кіналогіі пакуль на стадыі абмеркавання. Я вельмі асцярожна падыходжу да гэтага пытання, бо сам не спецыяліст у кіналогіі і абапіраюся на меркаванне экспертаў. Кіналогія — праблемная сфера. Палова ўсіх скаргаў ад паляўнічых звязаная з ёй.

Напрыклад, мы абавязаны развіваць групу парод, якія адносяцца да ганчакоў. Але тэрміны палявання, дзе выкарыстоўваюцца ганчакі, уладальнікі сабак лічаць недастатковымі. Да таго ж паляўнічыя ўгоддзі дзеляцца на зоны, дзе можна з сабакамі паляваць і дзе нельга. Апошніх больш. І такіх момантаў, дзе маецца канфлікт інтарэсаў, шмат. Мы супрацоўнічаем з Беларускім кіналагічным таварыствам, выслухоўваем усе бакі і шукаем аптымальныя рашэнні. Работы тут яшчэ вельмі шмат і яна патрабуе часу.

Беларускае таварыства паляўнічых і рыбаловаў падобнае на вялікі карабель, які ідзе сваім курсам. Калі я змяню гэты курс на палову градуса, ужо добра. Крута паварочваць не збіраюся.

«Там, дзе паляўнічыя арганізаваныя ў дзейную структуру, прырода працвітае»

— Вы расказвалі ў СМІ пра ўдзел таварыства ў зарыбленні вадаёмаў, у выпуску аленяў у дзікую прыроду. Раскажыце, якім чынам тое адбываецца.

— Рыбаловы-аматары — члены нашай арганізацыі плацяць узносы, пэўная частка якіх (з 1 ліпеня амаль палова) ідзе на закупку і запуск у вадаёмы малька. Яго вырошчваюць рыбныя гаспадаркі. Гэту дзейнасць таварыства вядзе даўно і штогод нарошчвае. Мы купляем малька ўсіх асноўных для Беларусі відаў рыбы: сом, шчупак, акунь... Пералік вадаёмаў, якія падлягаюць зарыбленню, узгадняецца з міністэрствамі аховы прыроды і навакольнага асяроддзя, сельскай гаспадаркі, мясцовымі ўладамі.

Таксама мы купляем на спецыялізаваных фермах маладняк высакароднага аленя. Вырошчваем яго ў сваіх вальерах і выпускаем у дзікую прыроду — таксама на вызначаныя тэрыторыі. Цяпер у нашай краіне сфарміраваная бяспечная папуляцыя высакароднага аленя, якой нічога не пагражае — ні паляўнічыя, ні драпежнікі, ні эпідэміі. На парадку дня — лань.

Што датычыцца прыродаахоўнай дзейнасці, то мы, напэўна, найбольш зацікаўленыя ў біяразнастайнасці. Існуе парадаксальная формула: там, дзе паляўнічыя арганізаваныя ў дзейную структуру, там растуць папуляцыі жывёлін, павялічваецца біяразнастайнасць, у цэлым прырода працвітае. Мы не проста паляўнічыя, мы — элемент дзяржаўнага кіравання прыроднымі рэсурсамі, прычым вельмі эфектыўны, зацікаўлены і дастаткова прафесійны.

— Яшчэ адна з вашых ініцыятыў датычыцца браканьераў.

— Я хацеў бы, каб нашы супрацоўнікі мелі права складання адміністрацыйных пратаколаў аб зноўдзеных правапарушэннях прыродаахоўнага заканадаўства. Пакуль супрацоўнік БТПР, а такіх больш за 700 чалавек, не можа прыцягнуць браканьера да адказнасці. Разам з тым мы ўсе — службовыя асобы, і я не бачу перашкод, каб даць такія паўнамоцтвы.

— Ведаю, што ў вас ёсць мара — стварыць музей палявання.

— Беларусь — гістарычна паляўнічая краіна, музей палявання і рыбалоўства тут павінен быць. У іншых краінах такія ёсць. Гэта сведчанне пра гісторыю палявання, магчымасць сабраць калекцыі паляўнічых стрэльбаў, трафеяў, дакументаў, узнагарод... Я ўжо заклікаў членаў таварыства прыносіць усё цікавае. Кіраўнік дзяржавы падтрымаў ідэю. Пажадана, каб гэта быў філіял Нацыянальнага гістарычнага музея. Гэта забяспечыла б навуковы падыход, добрую арганізацыю. Мы, са свайго боку, выступілі б фундатарамі, збіральнікамі фондаў, метадыстамі.

— У вас ёсць асабісты вопыт дапамогі музеям...

— Так. Але не ў якасці паляўнічага. У Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны аддаў унікальныя рэчы ваеннага часу, якія засталіся ад дзеда. Бягомльскаму музею народнай славы на малой радзіме падарыў усю сваю калекцыю ваеннай зброі. Гэта досыць вялікая экспазіцыя. Цяпер там выстаўлены ўсе віды стралковай зброі часоў Вялікай Айчыннай вайны, ёсць унікальныя экспанаты. Папрасіў трымаць іх не пад шклом, каб можна было ўзяць у рукі.

— Што вы маеце на ўвазе пад выразам «цывілізаваная паляўнічая краіна»?

— Абавязковым элементам тут з'яўляецца наяўнасць індустрыі. Развітая паляўнічая індустрыя грунтуецца на актуальных законах, якія эфектыўна рэгулююць пытанні палявання і рыбалоўства ў краіне. Другі важны элемент цывілізаванай паляўнічай краіны — культура палявання. Гэта датычыцца і вопраткі, і ежы, і самога палявання, і выкарыстання зброі і сабак. Шмат чаго. І тут бясконцае поле для дзейнасці. Лічу, што ўзровень паляўнічай культуры ў Беларусі высокі, але дасканаласць меж не мае.

Ёсць яшчэ матэрыяльная база: зброя, патроны, экіпіроўка, начынне... На жаль, гэтага ў нас не стае. Прычынамі таму і санкцыі, і адсутнасць уласнай вытворчасці, і страчаная футравая індустрыя, і іншае. Сваю задачу бачу ў тым, каб змяніць гэту сітуацыю да лепшага ў рамках сваёй кампетэнцыі.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Сядзі і глядзі

Як гучыць Беларусь?

Далучаемся да класікі разам з тэлеканалам «Беларусь 3»

Галоўны культурны канал краіны прапануе сваім гледачам пазнаёміцца з дакументальным серыялам «Кампазітары Беларусі». У праекце распавядаецца аб творчасці беларускіх кампазітараў XX стагоддзя, сярод якіх Мікалай Аладаў, Анатоль Багатыроў, Яўген Цікоцкі, Іосіф Жыновіч. Таксама героем тэлеперадачы стаў народны артыст БССР Генрых Вагнер: сёлета святкуецца 100-годдзе з дня нараджэння кампазітара.

У выпусках праекта «Кампазітары Беларусі» распавядаецца аб самых значных фігурах у гісторыі айчыннай музыкі. Разам з музыказнаўцамі, дырыжорамі, музыкантамі-інструменталістамі і спевакамі аўтары праекта паглыбляюцца ўнутр творчага працэсу вядомых прадстаўнікоў акадэмічнай, народнай і эстраднай музыкі. Гледачоў знаёмяць з біяграфіямі кампазітараў, а іх творы выконваюцца прафесіянальнымі калектывамі: аркестрам і хорам Белтэлерадыёкампаніі, Брэсцкім гарадскім студэнцкім духавым аркестрам Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі і іншымі калектывамі. Каб зацікавіць гледачоў і зрабіць выпускі больш насычанымі, у «Кампазітарах Беларусі» выкарыстоўваюцца архіўныя кадры, а распавядаюць аб героях іх сваякі, калегі і вучні.

Аўтар праекта Кацярына Страха расказала, што адной з галоўных мэт падчас стварэння перадачы было далучэнне моладзі да айчыннай музычнай культуры. «Менавіта таму ўзялася за праект: я якраз адношу сябе да моладзі і бачу, што мы ў гэтым пытанні не падкаваныя. Разам з нашымі гледачамі я адкрываю старонкі музычнай гісторыі — для сябе ў тым ліку», — адзначыла аўтар праекта.

Даведацца аб тым, як нараджаецца геній, можна з панядзелка да чацвярга ў 23.20 на тэлеканале «Беларусь 3».

ШАШКІ («Звязда»)

Выпуск № 170

З 11 да 15 ліпеня ў Жыровічах адбыўся XII Адкрыты рэспубліканскі турнір па шашках-100, прысвечаны Дню вызвалення Слоніма. Перамог Георгій Выдзерка (Гродна). На другім месцы Аляксей Куніца (Мінск), на трэцім — Расціслаў Лысюк (Жодзіна).

№ 98

№ 98

Белыя простыя: a5, d6, h6, e7 (4)

Чорныя дамкі: d8, f8 (2)

На дыяграме эцюд складзены вядучым аддзела. Белыя пачынаюць і робяць нічыю.

Дзве наступныя пазіцыі даслаў Юрый Мурадаў з Барысава.

№ 99

Белыя простыя: b4, e5, f6, g1, g5, h2, h4, h6 (8)

Чорныя простыя: b2, c7, d2, d6, e3, f2, f4, g3 (8)

№ 100

Белыя простыя: g1, h2, h4, g5, b6, d6, f6, h6, e7 (9)

Чорныя простыя: b2, d2, f2, e3, g3, b4, f4, a5, f8 (9)

Мініяцюры ў шашкі-100 склаў Пётр Шклудаў (Наваполацк).

№ 101

Белыя простыя: 17, 18, 19, 21, 22, 27, 32 (7)

Чорныя простыя: 7, 8, 9, 16, 31, 33, 36 (7)

№ 102

Белыя простыя: 11, 13, 19, 21, 35, 38, 44 (7)

Чорныя простыя: 10, 12, 20, 24, 28, 30, 40 (7)

№ 103

Белыя простыя: 19, 23, 24, 30, 32, 39, 41 (7)

Чорныя простыя: 8, 10, 13, 14, 28, 35, 42 (7)

Наступныя пазіцыі па правілах бразільскіх шашак склаў Дзмітрый Камчыцкі (Магілёў).

№ 104

Белыя простыя: c1, f2, e3, b4, g5, d6, e7 (7)

Чорныя простыя: b2, d2, a3, f4, c5, f6, h6 (7)

№ 94 1. e5-d6 h6:b4 2. d6:h6 c5:e3 3. h6:h2 +

№ 105

Белыя простыя: c1, f2, e3, b4, g5, d6, e7 (7)

Чорныя простыя: d2, h2, a3, f4, c5, f6, h6 (7)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць, у № 98 нічыя. Імёны чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

2 ліпеня на 78-м годзе пайшоў з жыцця Віталь Рубенавіч Габрыелян — міжнародны гросмайстар, 4-разовы чэмпіён СССР, прызёр чэмпіянату свету, чэмпіён Беларусі. Апошнія 30 гадоў жыў у Мар'інай Горцы, на радзіме жонкі. Быў арганізатарам і спонсарам шашачных спаборніцтваў у г. Мар'іна Горка, аказваў спонсарскую дапамогу юным шашыстам горада. Яго светлай памяці прысвячаюцца сённяшнія кампазіцыі.

Праверце свае рашэнні:

Выпуск № 169 ад 08.07.22.

№ 91 1...19-23 2. 28:30 25:34 3. 33:24 11-17 4. 39:30 17-21 5. 26:17 12:41 +

№ 93 1. e3-d4 c5:e3 2. a3:e7 h6:f4 3. e7-d8 c7-b6 4. d8:a5 e3-f2 5. a5-e1 f2-g1 6. e1-g3 f4-e3 7. g3-f2 e3-d2 8. c1:e3 +

№ 94 1. e5-d6 h6:b4 2. d6:h6 c5:e3 3. h6:h2 +

№ 95 1. e5-f6 h6:b4 2. f6:h4 c5:e3 3. h4-e1+

№ 96 1. e5-d6 h6:b4 [1... c7:e5 2. d4:a5 h6:b4 3. a5:h8] 2. d6:h6 c5:e3 3. h6:a5 +

№ 97 1. e5-d6 h6:b4 2. d6:h6 c5:e3 3. h6:c7 d8:b6 4. a1-b2 +

Першымі дакладныя адказы даслалі: С. Рашэцін (Ашмяны), С. Бурко (Орша), В. Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.), У. Дударэвіч (Брэсцкая вобл., Баранавіцкі р-н, в. Новая Мыш), А. Галаванаў, П. і В. Шульгі (усе — Мінск), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва — Мядзел), У. Панько (Каменец), І. Ананіч (Гродна), У. Ваўчкоў (Маладзечна).

Пішыце на адрас: газета «Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013,

e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru

Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.

Настальгія

ВІР ІМКЛІВАГА ЖЫЦЦЯ

Перабудова, юнацтва і першае каханне: глядзім фільмы «Маленькая Вера» і «Вам і не снілася»

У суботу «Беларусь 3» верне гледачоў у часы перабудовы: у 23:00 пачнецца паказ драмы «Маленькая Вера». Падзеі фільма адбываюцца ў невялікім прыморскім гарадку. Вера, галоўная гераіня стужкі, толькі скончыла школу. Яе цікавяць дыскатэкі і сустрэчы з сяброўкамі. Усё змяняецца, калі дзяўчына сустракае Сяргея, хлопца, які вырас у зусім іншых умовах. Для Веры ён быццам іншаземец. Ці атрымаецца ў маладых зразумець і пачуць адно аднаго?

